Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatą pocztową uiszczono ryczałtem.

ГОЛАС ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 13 — Вільня, Субота 26-га траўня 1928 г. — Год 1

Дванаццаць гадоў.

Тое, што можна было прадбачыць, што прадчувалася ўсім народам—сталася чатырох паслаў „за арганізаваньне сьпіску пад назовам „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“—маюць кожны па дванаццаць гадоў катаргі і ўжо ўсе разам з іншымі асуджанымі на менш па частках адпраўлены ў розныя турмы Польшчы. Не памаглі ні бліскучыя прамовы абаронцаў, выстаўляючых доказы нявіннасьці самымі, здавалася, важнымі аргумэнтамі, ні высокі культурны зровень галоўных асуджаных, ні ясная, здавалася, шкадлівасьць цяжкага прыгавару для самай дзяржавы — „справядлівасьць перамагла“.

Мы ня маем права на старонках газэты, згодна існуючых законаў, вынесьці свайго голасу протэсту, як газэта, якая бароніць справу працоўных, бо гэта будзе—„выхваляньне палітычнай зброднi“. Што-ж зробіш? Ня можна — сілай, як той казаў, на ражон не палезеш. Але мы пэўныя, што і бяз гэтага пратэсту—прыгавар раскаціцца гучным рэхам сярод працоўных ня толькі па ўсей Зах. Беларусі, дзе тварцы Грамады вядомы ў кожнай вёсцы, а і па ўсяму сьвету. Ня маем права выказаць, якое гэта будзе рэха, бо гэта будзе — таксама „выхваляньне палітычнай „зброднi“. Будзем гаварыць аб'ектыўна і рачова — на гэта, здаецца, маем права. Будзем вельмі кароткі.

Па нашаму глыбокаму пераканаьню, не чатыры галоўныя асуджаныя стварылі стотысячную Грамаду, а сама стотысячная Грамада, мала таго—ўвесь беларускі працоўны Народ—высунуў на верх жыцьця названых людзей. Грамаду стварылі тыя абставіны, у якіх знаходзіўся і знаходзіцца беларускі працоўны народ. Грамада была пробай беларускіх працоўных гушчаў дабівацца палепшаньня свайго быту, некаторай зьмены грамадзка-гаспадарчых абставінаў легальным шляхам, карыстаючыся г. зв. дэмакратычным правам. Так глядзелі і шмат якія з абаронцаў асуджаных. Суд інакш паглядзеў на гэтую справу; Грамада асуджана.

Але ці зьнішчана Грамада? „Kurjer Wileński“ стала цьвердзіць, што Грамада існуе.

Мы скажам, што дух Грамады існуе, бо існуюць тыя абставіны, якія зрадзілі Грамаду, абставіны, якія ёсьць заўсёды запраўдным тварцом усякага жывога руху.

А гэтыя абставіны—існуюць.

Скандал у лоне эўрапэйскага сацыялізму.

Сярод эўрапэйскіх сацыялістаў—запраўдны скандал.—Адзін з выдатнейшых павадыроў II Інтэрнацыяналу, дырэктар Міжнароднага Бюро Працы ў Жэнэве, францускі сацыяліст Альбэр Тома, апынуўся ў Рыме... ўчасьнікам кангрэсу фашыстаўскіх так зван. „праф. саюзаў“, якія ў істоце сваей зьяўляюцца—прымусовымі арганізацыямі, дзе работнікі і працадаўцы засядаюць разам і „згодна“ павінны — пад кіраўніцтвам „надклясавага“ фашыстаўскага ўраду—вырашаць усе спорныя ды спрэчныя справы ўзаемных адносінаў працы і капіталу... „Роботнік“ падчыркивае, што гэтыя „фашыстаўскія „праф. саюзы“ ня маюць нічога супольнага з вольным прафэсыянальным рухам работніцкай клясы“.

Зьяўленьне на такім прымусовым кангрэсе ведамага павадыра вольнага прафэсыянальнага руху ўжо выклікала „зьдзіўленьне“ у кругох міжнароднага сацыялізму. Адначасна ўся фашыстаўская прэса захапляецца трыумфам дый выхваляе на ўсе лады павадыра міжнароднага сацыялізму, які—„урэшце зразумеў сілу і праўду фашызму“, што і прыехаў асабіста з „цывільнай адвагай“ заявіць на кангрэсе...

Скандал пачаў шырыцца, дык на „ратаваньне палажэньня“ выступіў сам Адлэр, адзін з павадыроў „лявіцы“ і галоўны сэкрэтар II Інтэрнацыяналу, тады, як А. Тома належыць да „правіцы“.

У венскай „Работніцкай Газэце“ Адлэр зьмяшчае вялізарны артыкул, якім—з цэлым сьцягам агаворак дый засьцярогаў, — „разумеючы ўсю трудаасьць афіцыяльнага становішча А. Тома—сацыяліста — ўрадоўца Лігі Нацыяў—„дырэктара Бюро Працы“—ў сучасных капіталістычных варунках“, усе-ж дае здарова дыхту гэтаму „сацыялісту-ўрадоўцу“ за яго чарговы „няўхільны кампраміс“...

Дык сьвятня Адлэр, адначасна пракурор і адвакат свайго „таварыша“, хваліцеля Мусоліні, А. Тома, шукае дый збірае ўсё, што можа — дзеля „апраўданьня“ абвінавачвага.—Вось, кажа ён, напрыклад,—на што ўжо непрымірымы камуністы, але і яны высылаюць сваіх „таварышоў“—пасламі пры капіталістычных урадах замежных дзяржаў...

Далей ён кажа, што гэты тав. Тома шмат добрага зрабіў для праф. руху, будучы дырэктарам Бюро Працы, чыноўнікам Лігі. Але—„чым больш запалу ўносіў тав. Тома ў сваю дырэктарскую працу, тым шпарчэй... адыходзіў ад сацыялізму“!... Як сьцьвярджае сам сэкрэтар Адлэр, II Інтэрнацыянал глядзеў на ўсе гэта скрозь пальцы,—ён змушаны тав. Тома „прызнаваць у сацыялізьме, калі ён робіць працу дырэктара Бюро Працы“... Добрая „падвойная бухгалтэрыя!—Але недарма-ж яна так і завецца — „італьянскай“! Дык на ёй тав. Тома і даехаў—да Рыму!

Але тое, што зрабіў гэты тав. Тома ў Рыме, выходзіць ужо залішне шырока і далёка—за межы самага „кампрамісовага сацыялізму“, да якога прызвычаілі нас нашы часы. „Тутака ня ідзе ўжо, кажа Адлэр, аб пераконаньні сацыяліста, але — аб самыя асноўныя прынцыпы работніцкага прафэсыянальнага руху“.—Пэўне-ж лепш, як хто іншы ведае тав. Тома—з якой страсьцю прадстаўнікі работнікаў баранілі на ўсіх кангрэсах Бюро Працы прынцып вольнасьці праф. саюзаў—проці надужыцьця фашызму. Бо-ж вольнасьць праф. саюзаў — для ўсяго работніцкага руху, а таксама і для Жэнэўскага Бюро Працы — прынцыповы варунак самага існаваньня гэтага руху, які паложаны быў у падставу і створанага гэтым рухам Бюра Працы. „Хто хістае прынцып вольнасьці праф. саюзаў, той тым самым падважвае самае Бюро Працы“. Дык тав. Адлэр вінаваціць тав. Тома ў тым, што ён, — „як кіраўнік установы, маючай служыць работніцкаму руху, расхіствае падставовыя правы, якія работніцкая кляса здабыла сабе ў доўгалетніх ахвярных баех“...—Абвіненьне — нябольш-нямеш, як у здрадзе работніцкага руху... Бо-ж—„тое, што Тома зрабіў у Рыме, ня толькі пацьвердзіла найгоршыя страхі, але—далека перавысіла іх“...

Тав. Адлэр ня трэбуе ўжо навет ад дырэктара Бюра Працы, каб ён лаяў разам з ім фашызм, разумеючы, што афіцыяльнае палажэньне зьвязвае яму язык сацыяліста ў губе ўрадоўца Лігі Нацыяў... Але калі гэты сацыяліст-урадовец пачынае „пяяць пахвальныя гімны ў чэсьць ворага“, абураючы гэтым увесь той вольны работніцкі прафэсыянальны рух, дык на гэта трэба сказаць, што як раз гэта яшчэ менш павінен і мае права рабіць—афіцыяльны кіраўнік гэтага руху, п. дырэктар Бюра Працы Лігі Нацыяў...

Усе—характэрныя кветачкі і ягадкі сучаснага „сацыялізму“, які—запраўды-ж—часам цяжка адрозьніць ад фашызму...

Прыгавар у справе Грамады.

Працэс Грамады кончаны. 22 траўня г.г. у 12 гадзіне дня, у салі Акружнага Суда ў Вільні быў адчытаны прыгавар суда над Грамадой.

Яшчэ зрана судовы будынак і калідоры былі абстаўлены лічбова павялічанай паліцыяй. Судовыя кулуары напаўняюцца публікай. Настрой падвышаны. Усе дэбатуюць, (прадугадваюць) аб прыгаворы.

Пропускі ў салю Суда пераглядаюцца вельмі ўважна. 12 я гадзіна. Публіка ўпускаецца ў салю Суда, якая запаўняецца ею аж да цеснаты.

Паўгадзіны наперад былі ўведзены падсудныя. Твары іх зьдзержаныя, зьлёгка толькі прабівае праз іх здэнэрваваньне. Былы пасол Мятла і Клаўдзія Гоцька—у беларускай нацыянальнай вопратцы.

У 12 і 30 мінут раздаецца званок. Уваходзіць суд ў асобах старшыні Аўсянкі і судзьдзяў Ёдзевіча, Барэйкі і Бжозоўскага. Некалькі мінут пануе поўная цішыня.

Старшыня Аўсяика чытае прыгавар, сілай каторага на моцы арт. 102, II час. К. К. засуджаны за „з'арганізаваньне сьпіску“ пад назовам „Беларуская Сялянска - Работніцкая Грамада“ **на 12 гадоў цяжкага вастрогу** былыя паслы: Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі, Павал Валошын і Пётра Мятла;

На 8 гадоў цяжкага вастрогу: Максім Бурсэвіч, былы сэкрэтар Цэнтральнага Сэкратарыяту „Грамады“ і Фабіян Акінчыц, б. юрысконсульт „Грамады“;

На 6 гадоў цяжкага вастрогу: Кузьміч (з Наваградчыны), Якімовіч, Шушкевіч Паддубік (з Горадні), Гелда (з Сакольшчыны), Саванец (з Слонімшчыны), Куліна-Куліноўскі (з Маладэчна);

На 5 гадоў цяжкага вастрогу: Патапчук (з Пружаншчыны), Сіняк, Якубчык, Якімовіч і Шацько (з Слонімшчыны), Драгун (з Горадзеншчыны), Козіч (з Сакольшчыны), Лабунька (з Дзісьненшчыны) і Антановіч (з Вялейшчыны);

На 4 гады цяжкага вастрогу: Клаўдзія Гоцька (з Наваградчыны), Я. Баліцкі (з Горадзеншчыны), Каўпак і Кот (з Пружаншчыны), Салыга (з Лідчыны), Шчыглінскі (з Ваўкавышчыны), Нікіфароўскі і Даніловіч (з Дзісьненшчыны) і Беламызы і Зданюк (з Сакольшчыны);

На 3 гады цяжкага вастрогу: Патоцкі, Харкевіч і Янкоўскі (з Ваўкавышчыны) і Марчык (з Слонімшчыны).

Агулам засуджана 37 чалавек, апраўдана—19 чалавек.

Унявіняны наступныя асобы: Антон Луцкевіч—старш. Нав. Т-ва, Р. Астроўскі — былы дырэктар белар. гімназіі ў Вільні і Банку. Шнаркевіч, сэкрэтар Гал. Управы Т-ва Бел. Шк., Коўш (сьвяшчэньнік), Навакоўскі, Міськевіч, Гурын (?), два Варанковічы, Кавалёў, Казачонак, Кавалевіч, Карніловіч, Сакалоўскі, Стоцік, Смакіла, Шэвель, Крупіца і Мармыш. У ліку апраўданых знаходзяцца 4 абвінавачваныя, западозраныя ў забойстве канфідэнта Івашкевіча.

Абвіненьне з 110 арт., аб забавязаньні суседняй дзяржаве—суд адкінуў.

Судовыя кошты, згодна з прыгаворам, маюць сумесна заплаціць засуджаныя.

Засуджаныя прынялі прыгавор з поўным стаіцызмам (мужна, спакойна). З нянеменшай годнасьцю прынялі яго і іх сем'і.

Праз хвілю цішыні старшыня пытаецца пракуратара аб яго ўнёску ў справе „środka zapobiegawczego“, пасьля чаго дае распараджэньне „bezwzględnego“ арэшту для засуджаных. Адначасна паведамляе, што апраўданыя будуць вечарам выпушчаны з вастрогу на волю.

Суд выходзіць. У гэты момант сярод цесна напаўняючай судовую салю публікі раздаюцца галосныя вокрыкі на чэсьць засуджаных. Няхай жывуць павадыры белар. народу і інш. Засуджаныя запялі „Ад веку мы спалі“. Усе прысутныя, як беларуская публіка, так і ўрадоўцы, паліцыянты і навет шпікі паўставалі; цывільная публіка—з пашаны і спачуцьця; урадоўцы ад уражаньня дэмастрацыі засуджаных і спачуцьця публікі, выявіўшайся ў кіданьні кветак на засуджаных. Адначасна на галовы засуджаных пасыпаліся белыя і чырвоныя кветкі, як падае прэса — кідае іх публічнасьць і, найбольш, прысутныя беларускія паслы д-р Дварчанін і Валынец. Паліцыя пачынае „ўсоўваць“ публіку—перш-на-перш арыштоўвае грам. Сіняўскага, былага вучыцеля І Беларускай Гімназіі ў Вільні за кіданьне кветак. Пры арышце грам. Сіняўскага некалькі разоў ударыў прысутны там агэнт тайнай паліцыі. Паслоў, д-ра Дварчаніна і Валынца паліцыя таксама „выкідае“ з салі. Калі ў пярэдняй пас. Дварчанін хацеў зрабіць інтэрвэнцыю ў справе арыштаваньня грам. Сіняўскага, гэты паліцыянт заступіў яму дарогу. Пасол запытаў яго, на чый прыказ ён гэта робіць, дык паліцыянт кінуўся да яго з насаджаным на стрэльбу штыхом. Нейкі „начальнік“ прыказаў вывесьці пасла. Пасьля гэтага, настаўляючы штык, паліцыянт (№1279) пхнуў пасла на сходы і пасол удзяржаўся толькі дзякуючы таму, што ўхапіўся рукою за наручу сходаў.

Тымчасам паліцыя акружыла моцным кардонам засуджаных, якія ў далейшым цягу пяюць „Ад веку мы спалі“.

Саля пусьцее. Абвінавачаных, абсаджаных моцна паліцыяй, па чародзе перавозяць аўтамабілем і закрытай карэтай ў вастрог.

Абвінавачаныя, якіх вязьлі на аўтамабілі, махаюць хустачкамі і кветкамі сабраўшайся на тратуарах публіцы.

Апраўданых выпусьцілі на волю вечарам.

Вываз засуджаных „грамадаўцаў“ з Вільні.

Праз некалькі гадзін пасьля прыгавору ўсіх засуджаных грамадаўцаў перавязьлі партыямі, пад моцнай ахранай на вагзал, дзе ад Тарговай вул. чакалі на іх два спэцыяльна адстаўленыя на гэта вагоны.

Адзін з вагонаў, у якім зьмясьцілі 21 засуджаных, між імі б. пасла Валошына, Акінчыца і Клаўдзію Гоцьку, прычапілі да цягніка, ідучага ў Варшаву праз Ліду. Другі вагон, месьцячы 16 вязьняў, а сярод іх б. паслоў Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Мятлу і Бурсэвіча, прычапілі да цягніка, які йдзе ў Варшаву праз Горадню.

Каманду над гэтымі вагонамі маюць спэцыяльна вызначаныя для гэтага афіцэры паліцыі.

Газэты („Słowo“ № 116, і „K. Wil.“ № 115) падаюць, што іх перш памесьцяць у Сьвятакрыжскім вастрозе, а потым разьмесьцяць ў вастрогах па розных гарадох.

Працэс Белар. Сялян.-Работн. Грамады.

47 дзень працэсу Грамады. 7.V 28 г.

У далейшым працягу свае прамовы пракурор **Раўзэ** прыступае да ўласьцівае ролі павадыроў Грамады. Бывшыя бел. паслы лічылі Сойм за трыбуну, з якой маглі прамаўляць беспасярэдня да народу. Гэтак Тарашкевіч 16.XI 26 г. кажа, што беларускі народ зразумеў імозарычнасьць парлямантарызму і „гатовіцца да паўстаньня“. Аб урадзе Пілсудскага кажа, што ён зьяўляецца толькі марыянэткай у руках Англіі проціў Радаў. Валошын называе Мін. Справядлівасьці міністр. несправядлівасьці і вастрогаў, судзьдзяў-жа — глумай царскае Расеі, якія маюць рукі, апырсканыя крывёю. Рак-Міхайлоўскі зазначае, што тактыкі навучыліся ад польскіх рэвалюцыяністаў. Па-за Соймам тыяж паслы заклікаюць людкасьць не плаціць падаткаў, браць усё самім, не чакаючы, пакуль дадуць. У Паставах на мітынгу Тарашкевіч сказаў, зьвяртаючыся да паліцыянта, „льецца кроў пад батам Пілсудскага, але заўтра паліецца ваша“. Праграму Грамады прадыктаваў „Wielki mistrz“ у 1920 г., і толькі дзеля сьмеху дадаў арт. 51, у якім гаворыцца „ўсяго гэтага мы хочам дамагацца легальна“. Арганізатары Грамады на груньце легальнае працы стварылі „śpisek“, на які даўся злавіцца цёмны народ беларускі. Не адзін за гэта пайшоў у вастрог. Далей пракурор абгаварвае ролю ў Грамадзе дзеячоў расей-

скае рэвалюцыі, як Акінчыц і Бурсэвіча. Абодвы яны лічылі сябе расейцамі, а Акінчыц быў старшынёю Ц. І. К. у Ноўгарадзе. Ці-ж можна казаць, што Грамада імкнулася да пашырэньня народнае сьведамасьці, калі на чале яе сталі расейцы, татары, жыды?—пытаецца пракурор.

Дзеяльнасьць Грамады праяўлялася і ў МОПР (Міжнар. Арг. Помачы Рэвал.). Кіравалі ёй Валошын і Астроўскі, штабам быў Цэнтр. Сэкрэтар. Грамады. Грошы на помач вязьням палітычным ішлі вялікія і расходы на гэтую мэту не маглі быць пакрыты з дыет пасольскіх.

Адносна рэлігіі Грамада заняла адразу варожае становішча. Грамадавец Шымкевіч, вучань Астроўскага, зазначае, што „датуль будзе весьці камуністычную працу, пакуль абраз Маткі Боскае Вострабрамскае ня будзе спалены". „Маланка" высьмявае сьв. Камуніё. Абв. Валошын на мітынгу ў Каяшчызах крычаць: „прэч з ксяндзамі! няма розьніцы паміж ксяндзом і паліцыянтам"!... Згодна з атрыманымі інструкцыямі, Грамада выступала варожа процiў камасацыі і палаткаў. Войты не ведалі, што рабіць. Спакойныя сяляне зьвярталі ўвагу на агітацыю: „да чаго яна давядзе"?

Пасол Мятла захапляецца тым, што бачыў у Расеі. За прыкладам пасло̆ў, гурток у Чорнай Руце пастанаўляе паслаць у Расею Кузьміча і Шарка дзеля навучаньня лучнасьці. Калі ўжо Грамада арганізавалася, правадыры яе, ведаючы, што рэвалюцыю робіць натоўп, пастанаўляюць выкарыстаць яго. Робіць гэта ў Вільні і на паветах. У Вільні маем дэманстрацыю ў студзеню 1926 г., на праўніцы — у Косаве.

На грамадаўскую прэсу Рады давалі вялікія сумы, бо разумелі яе значэньне. Прэсай кіраваў Луцкевіч. У прэсе падкрэсьлівалася, што Грамада імкнецца да такога вырашэньня беларускага пытаньня, як гэта зроблена ў Радавай Расеі. Факт, што грошы на прэсу давалі Рады, пацьвярджае Гурын. Абв. Рак-Міхайлоўскі стараўся пераканаць, што выдаткі на прэсу пакрываліся даходамі. Але трэба верыць Гурыну.

Адносна Луцкевіча пракурор кажа, што ён кіраваў прэсай грамадаўскай. Пацьвярджаюць гэта сьведкі.

Луцкевіч—асабістасьць вельмі цікавая: ад паляка, шляхціца і да беларуса — палякажэрцы. Быў платным агентам нямецкім, пасьля-ж — платным агентам бальшавіцкім.

У канцы сваей прамовы пракурор старецца даказаць, што Луцкевіч праз увесь час прыймаў учасьце ў палітычным жыцьці.

Аб канфэрэнцыі ў Гданску пракурор Раўэз кажа праз зачыненыя дзьверы.

48 дзень працэсу Грамады.

У далейшым працягу прамаўляе прак. Раўэз. Тактыка Грамады, кажа ён, была знамяітая. Дэмагогія пацягнула шыбкае развіцьцё Грамады. Усюды і ўсьцяж выступае квестыя зямельная. Зямлю атрымаюць тыя, якія ўступяць у Грамаду. Нідзе няма мовы аб незалежнасьці Беларусі. Паступ Грамады пацягнуў за сабой узрост крымінальных праступкаў наагул. На абшары толькі аднаго віленскага ваяводзтва было 1000 адміністрацыйных спраў.

Білі паліцыянтаў, выганялі іх, а яны не рэагавалі... бо не хацелі спляміць мундзіра(?!). Гублялася пашана, што можна і чаго ня можна. І нічога дзіўнага, што ўсе грамадзкія арганізацыі, пав. соймікі зьвярталіся да цэнтральных улад з мэмарыяламі аб патрэбе ліквідацыі Грамады. Мне здаецца, што ня можна казаць, быццам з 14/15.І 27 г. зроблена гвалт. Гэта быў акт самаабароны са стараны дзяржавы.

Далей пракурор старэцца даказаць, што Тарашкевіч не зьўляецца ідэйцам, але чалавекам кар'еры. Ён пераходзіў з аднаго абозу ў другі. Пачаткава быў палякам, пасьля зрабіўся беларусам.

Канчаў сваю прамову прак. Раўэз гэткімі славамі: „Адвечная трагедыя Польшчы паўтараецца. Яшчэ не скадыфікаваў вялікі Карсыканец (Напалеон) здабычы рэвалюцыі, а ўжо ліквідавалі Польшчу перакупленыя праз пасланьніцтва расейскае, пасла Рэчыпаспалітае. Высокі Суд відзіць цяпер бледныя абрыс Польшчы, на які гатовы кінуцца са штылетамі людзі. Я пазнаю іх—гэта абвінавачаныя. Трэба гэтую небясьпеку прыкрыць, як гэта зрабілі Грэкі з пекнымі статуямі сваіх багоў.

Пракурор дамагаецца ўкараньня абвінавачаных паводле 102 арт. ч. 2 К. К.

Мова пракурора Калапскага.

Высокі Суд! Заданьнем маім зьяўляецца праставіць антыдзяржаўную акцыю Грамады на абшары 4 ваяводзтваў. Паўстае пытаньне — чаму гэтая акцыя, пачатая легальнай Грамадой, знайшла спачуваньне пасярод людзкасьці і ў працягу кароткага часу лічыла аж 87 тыс. сваіх сяброў. Крыніцай гэтага зьяўляецца бальшавіцкая інвазыя 1920 г., калі людзкасьці былі прышчэплены бальшавіцкія гаслы. Не здарма адзін выбітны камуніст сказаў: „Мова мы і адойдзем, але так трахнём, што Эўропа затрашчыць". Часы Гонты і Жалязьняка вяртаюцца. Паўтараюцца напады на двары, цягнікі і мястэчкі. Калі абарона граніц перайшла да КОР, то здавалася, што можна будзе адпачыць і начых рэалізаваць трактаты і ўставы, датычучыя нар. меншасьцяў у Польшчы. Але гэта не сталася, бо перашкодзіла дзеяльнасьць Грамады.

Далей прак. Калапскі прыступае да характарыстыкі дзеяльнасьці Грамады ў пасобных паветах.

Пав. Навагрудзкі. Было тут 228 гурткоў і 5623 сяброў. Спатыкаюся тут з дзеяльнасьцю Кляўдыі Гоцькі і Янкі Кузьміча.

Абое—сябры КПЗБ, арганізуюць дэманстрацыі камуністычныя і г. д.

Пав. Стаўпецкі. Тут Галоўным арганізатарам гурткоў быў Міськевіч, падазраваны ў належнасьці да КПЗБ.

Пав. Вялейскі. На абшары гэтага павету галоўным дзеячам быў абв. Антановіч, сэкр. пав. Камітэту. Пашырау ён антыдзяржаўныя гаслы і падбураў да паўстаньня.

Пав. Дзісенскі. Тут акцыя Грамады распачалася найраней. Было тут 159 гурткоў, лічыўшых 10286 сяброў. Абв. Сакалоўскі, звычайны сябра Грамады, займае паважнае становішча дырэктара аддзелу банку ў Глыбокім. Абв. Стоцік быў сэкр. пав. Камітэту Грамады і казаў на сабраньні, быццам Мятла будзе прышлым ваяводай, Нікіфароўскі-ж — старастай Дзісенскім. У Стоцкага знойдзена пры рэвізіі дзьве адозвы з жаданьнем амністыі. Абв. Нікіфароўскі намаўляе да складаньня жаданьня на паліцыю, польскіх вучыцялёў і кажа, што білет Грамады зьўляецца прапускам у Расею. Быў ён на тайным сабраньні Грамады, але і КПЗБ. Абв. Лабунька арганізаваў 20 гурткоў. Намаўляў асадніка Паўлюця, каб ён уцягваў да працы ў Грамадзе афіцэраў КОР-u. Пры арыштаваньні гаварыў да паліцыянтаў: „а мы вас усё-раўно пераможам".

Пав. Слонімскі. Лічыў 167 гурткоў і 4754 сяброў. Абв. Савансі арганізуе нелегальныя сабраньні ў лесе і кажа на іх аб зброі.

Пав. Гарадзенскі. Тут было 220 гурткоў і 5519 сяброў. Абв. Якімовіч быў ініцыятарам высыланьня лісту прывітальнага да б. пасла Барана. Абв. Паддубік зьбірае складкі на вязьняў палітычных. У абв. Драгуна знойдзена стральбу.

Пав. Сакольскі. Лічыў 18 гурткоў і 300 сяброў. Найбольш актыўнымі дзеячамі зьяўляліся тут абв. Гелда, Зданюк, Беламызы і Козіч.

Пав. Пружанскі. На абшары яго вялі сваю дзеяльнасьць абв. Калпак, Гмыр і Патапчук. Віна іх палягае на тым, што зьбіралі ахвяры на палітычных вязьняў.

На абшары пав. Лідзкага і Ваўкавыскага вялі дзеяльнасьць абв. Салыга, Крупіца, Мармыш, Шкодзіч і Патоцкі. Выхвалялі яны лад Сав. Расеі і казалі аб паўстаньні вясной 1927 г.

Прамова пасла Я. Гаўрыліка

прадстаўніка Беларускага Клюбу „Змаганьне Сялян і Работнікаў" на пленарным паседжаньні Сойму 15-га траўня 1928 г. падчас дыскусіі над выдачай суду пасла Сахацкага.

Беларускія паслы, якія прайшлі ў Сойм па працоўных сьпісках, што нейкім дзівам засталіся не скасаванымі, утварылі Клюб „Змаганьне".

Прадстаўнікі гэтага Клюбу ў часе першых паседжаньняў Сойму некалькі разоў дамагаліся слова, каб у праграмнай грунтоўнай прамове падаць сваю пазыцыю, адпавядаючую сацыяльнаму і нацыянальнаму палажэньню беларускіх працоўных масаў, якую яны займуць у сваёй парлямантарнай дзейнасьці.

Аднак, гэтага зрабіць ім не ўдалося, бо маршалак Сойму пад рознымі прычынамі слова прадстаўніку Клюбу „Змаганьне" ня даў

Трэба спадзявацца, што Клюб „Змаганьне" зробіць гэта ў бліжэйшых наступных паседжаньнях Сойму.

Пададзеная ніжэй прамова пас. Я. Гаўрыліка, як сказаў сам прамоўца, хоць ня выходзіць з духу праграмы Клюбу, але ёсьць выпадковай, выкліканай раптоўнай справай выдачы суду пасла ў Сойме — прадстаўніка польскага пралетарыяту.

Падаем яе ніжэй па стэнаграме:

Высокая палата! Ня ўмею добра гаварыць папольску, бо ёсьць беларусам, але, калі гэтага вымагаець рэгулямін, прымушаны да яго застасавацца.

Ня толькі я, але звыкла ўсе прамоўцы так зварачваюцца да Сойму: „Высокая Палата"!

Так, палата высокая, прынамсі павінна была быць-бы гэткай. Есьць прыказка: „Хто сам сябе не паважаець, таго і другія паважаць ня будуць". Адсюль: „Калі Высокая Палата сама сябе не паважае, дык хто-ж яе паважаць стане"?

А Сахацкі-ж ёсьць паслом Сойму, яго складовай часткай, і выдача яго з увагаў палітычных ёсьць бязумоўна доказам непавагі Сойму да самога сябе.

Тут ёсьць паслы з розных куткоў польскае дзяржавы, але прышлі яны сюды разнальковымі дарогамі. (Галасы:—О, гэта пан слушна зазначыў).

Значная большасьць іх прышла бяз жаднага клопату: іх прасілі, іх клікалі, іх падпіхалі.

Затое мне і маім калегам ніхто тут сказаць ня можа таго, што аднаму паслу сказала лявіца: „Аддай мандат: яго табе дала паліцыя"!

Вось-жа такімі дарогамі паліцэйскае дапамогі і яшчэ горшымі спосабамі значная частка паслоў прышла сюды.

Беларускі працоўны народ змог паслаць сваіх прадстаўнікоў у Сойм у вельмі малым ліку, а чаму гэта сталася — хіба ўсім вядома. Есьць сцьверджаным фактам, ведамым ня толькі ў Польшчы, але на цэлы сьвет, што выбары праводзіліся нячуванымі спосабамі. Былі такія выбарчыя надужыцьці, якіх жадная сьледчая камісія выявіць ня зможаць, хоць-бы справаздача яе была як найлепшай. (Голас: Што гэта мае да Сахацкага?).

Ніякая чалавечая фантазія не змагла-б уявіць з якімі гвалтамі і надужыцьцямі былі праведзены выбары. (Голас: Ці пан гаворыць на тэму?). Так, гавару на тэму, бо вы, панове, гэты гвалт і ўціск хочаце ўвясьці і сюды, на тэрэн соймавы, застасаваць гэтыя спосабы да парлямантарнае працы, на груньце якой быццам-бы трымаецеся.

Мы ў гэту парлямантурную працу ня верым і адкрыта гаворым, што ня прышлі сюды з вераю у тое, быццам на груньце парлямантарным можна-б было палепшыць долю нашага працоўнага народу; нас надта мала прайшло для гэтагага праз тыя жалезныя абцугі, якія былі пастаўлены ў выбарным часе.

А калі мы прышлі сюды, дык толькі таму, што беларускі працоўны народ хацеў паказаць цэламу сьвету, што зможа разбурыць усякія муры, стаўляныя на дарозе яго жаданьняў і імкненьняў і бліскуча даказаў гэта, правёўшы сваіх прадстаўнікоў у Сойм, наперакор выбарчаму тэрору.

Вось-жа гэты гвалт над работніцкім прадстаўніком тут у парляманьце ёсьць далейшым працягам сталага ўціску, ня толькі працоўнага беларускага народу, але й працоўных масаў Польшчы.

Той самы пасол з адзінкі, катораму „мандат дала паліцыя", сказаў раз: „Я, пан Радзівіл і Сапега выступаем разам, бо і я паляк, і Радзівіл паляк і Сапега паляк".

Запытаюся таго пана пасла: а Сахацкі ці-ж таксама не паляк? (Голас: Не, прадажнік!),

І не зважаючы на тое, што я беларус, а Сахацкі паляк, выступаю ў яго абароне, дзеля таго, што ўсе мы працоўныя гушчы і беларускія, і польскія, і ўкраінскія і іншыя, усе аднолькава прыгнечаны, аднолькава вызыскованы. І таму, каб узмоцніць сваю адпорную сілу, мусім злучыць разам свае рады, згарнуць мазольныя рукі працоўных у адзін кулак.

Вам, панове, тут на паседжаньнях весела, часта чутно ваш сьмех. Але, паны, я кажу вам, што ёсьць, апрача вас, працоўны народ, катораму не да сьмеху. Гэты народ сашчаміў кулак, сьціснуў зубы і чакаець хвілі, калі і ён засьмяецца.

Напалеон калісь сказяў, што француская рэвалюцыя нікога нічога не навучыла.

Ведаеце, панове, расейская рэвалюцыя вас таксама нічога не навучыла.

Навука цьвердзіць, што ў прыродзе, у матэрыі, нішто ня гіне.

Скажу таксама, што і ў гісторыі нічога не прападае. Кожны ўчынак павінен выклікаць вынікі, як прычына выклікаець пасьледзтвы.

За чыны бацькоў адказваюць дзеці, за віну дзядоў пакутуюць унукі.

Не забывайцеся, паны, аб будучыне.

Там, на тым баку, у часе расейскай рэ-

Воля і доля сялян-беднякоў.

(**Апавяданьні**).

Старшыня Мялешаўскай гміны — Янка Дзяцел, нядаўна прабудзіўшыся, хадзіў з кута ў кут па сваім пакоі ля гміны. Сноп сонечных праменьняў, прабіўшыся праз гушчар росшай ля вакна рабіны, падаў на стол і, здавалася, забаўляўся з чарнільніцай, у якой яны гарэлі, іскрыліся і разьбягаліся зайчыкамі па сьценах. На двары вясёла пяялі шпакі ды шчабяталі іншыя птушачкі, быццам вітаючы і цешучыся такім ясным цёплым ранкам. Толькі штось старшыня не падзяляў гэтай іх радасьці: на яго твары лягла якаясь невясёлая думка. Злосна махаючы рукой, быццам грозячы камусь нявідомаму, ён барматаў: — я вам пакажу перавыбары!.. Другога хочаце паставіць?.. Ня ведаю, ці ўдасцца вам гэтая штука, пачакаеце крыху! Ня высахлі яшчэ мае мазгі, каб да гэтага дапусьціцца. Хочуць мяне скінуць... дрэнны, іншы лепшы будзе... Дурні! Кожын сябе ня скрыўдзіць, ды будзе танцаваць пад дудку начальства — йначай, каб і хацеў, ня можна... Вяршылу маняцца выбраць, безгаловыя! Ен тут і месяца не праслужыў-бы. Трэба ўмець ладзіць з начальствам, кожнаму ўслужыць, не пярэчыць, а іначай вылеціш адсюль, як піць даць, і вашы выбары нічога не памогуць!.. Аднак, папрацаваць мне трэба шмат, з тым-сім пагутарыць; маю, дзякаваць Богу, досьць хаўрусьнікаў, трэба толькі паставіць іх на ногі, пакіраваць імі...

Як Янка зрабіўся старшынёй і яго праца.

Дзяцел меў ужо гадоў сорак, нямнога сутулы, худашчавы. Яго шумясты вус, як у украінца, зьвісаў канцамі ўніз, невялікія хітрыя вочкі заўсёды беспакойна бегалі, быццам чагось шукаючы. Тры гады таму ён сядзеў па ўсей вакалічнасьці за „вольнадумства". Ен абураўся на начальства, крытыкаваў старшынаў, ведаў усе іх хітрыя „штучкі", казаў, што ўсе яны крыўдзяць беднякоў-сялян, шахруюць яго працоўным грашом і г. д. Адзін раз за якуюсь гутарку на фэсьце яго арыштавалі і Янка месяцы тры прасядзеў у турме, але гэта мала яго зьмяніла і ён надалей цьвярдзіў сваё.

— Вось дык чалавек! — гаварылі сяляне.—На старшыню яго выбярам, браткі! На старшыню! Хай ён ім задасьць перцу!

На сходзе ўсе галасавалі за Дзятла і правялі на старшыню. Земскі не хацеў яго зацьвердзіць і назначыў паўторныя выбары. Але гэта толькі падліло масла ў вагонь.

— Не спадабаўся! Калючы ён для вас! Дзятла!!! Другога ня хочам!—дружна крычалі сяляне і земскі хочучы-няхочучы мусіў пагадзіцца з гэтым. Усе прысутныя былі вельмі здаволеныя, толькі Кастусь Вяршыла з Дубнікаў, які чытаў газэты, кніжкі, даваў часта суседзям праўныя і іншыя парады, чалавек, як казалі, „бывалы"—сумліўна ківаў галавой, кажучы:

— Пачакайце, браткі, пабачым, што будзе рабіць! Гаварыць-то можна, а на дзеле-ж ён сябе яшчэ не паказаў.

Але больш за ўсіх быў здаволены сам Дзяцел — нарэшце збыліся яго даўгалетнія мары! Дагэтуль ён зайздросьціў і пісару, і старшыні, і станавому; пільна сачыў за кожным іх шагам і цікавіўся навет самымі нязначнымі праявамі іх прыватнага жыцьця.

— Чаму, думаў Янка, ня я на іх мейсцы? Патрапіў-бы і я пяром скрыпець — не здарма-ж народнае вучылішча скончыў! Добра жывуць, не працуюць, чысьценька ўбраўшыся самі, дзеткі, а ты?.. Здаецца-ж і ў мяне ня кепская гаспадарка, б'ешся, працуеш, як вол, у гразі, а ледзь-ледзь пражываеш. І аб усім табе галава баліць: то засушыла, то згніло, то градам выбіла, а расход усёроўна сваім чарадом: і парабку заплаці, і падаткі падай і плуг купі, вупраж, і калёсы, і атосьсе! А жыцьцё-ж наша! Якую прыемнасьць відзіш? Увесь разрывак, што ў царкву калі з'езьдзіш. А яны — і ў тэатр, і на баль, і вып'юць і ўсё такое. Эх-хе-хе!—уздыхаў ён пасьля такіх думак і вельмі хацеў хоць гадок пажыць „па-людзку", папанску, ня так, як жыве мужык-сярмяжнік. Аж зіяў Янка ад радасьці, што ўсё-ж такі дапяў свае мэты.

Перад старшынёй ужо—Дзятлам, лягглі два шляхі: — адзін—цярністы вузкі, поўны калдобінаў і ямаў, у якія ў кожны момант можна ўляцець з вазом і другі — шырокі—гладкі, вякамі наежджаны, на якім толькі каці на рысаках. І ён хутка ў-ва ўсю моц пакаціў па гэтым апошнім. Заўважыў, што пісар за ўсялякую справу бярэ хабары, а хто не дае, мучыць, цягне наўмысьне справу. Людзі скардзіліся Дзятлу, але што-ж ён мог парадзіць? Зрабіў раз выгавар, але той так адфыркнуўся, што Янка ня ведаў, куды дзявацца. Прагнаць?—зазлуецца земскі, бо-ж пісар яго якаясь дальная радня, а начальства злуецца, то ўжо кепская рада—дзяржы вуха вострa: пайдуць рэвізіі, кантролі, усялякія прыдзіркі.

Стыдна-ж старшыні абціраца ля паноў у мужыцкай даматканай вопратцы—заказаў Дзяцел сабе гарнітур, пальцішка, запрасілі на баль—гульнуў там трохі, схадзілі з пісарам, пад вясёлую руку, да „паненак" і цераз месяц меў ужо штось каля сотні руб. доўгу. Пабедаваў раз аб гэтым перад пісарам, той толькі ўсьміхнуўся і паказаў яму крыніцу, з якой можна чарпануць і не адну сотню. З таго часу зажыў старшыня з пісарам дружна і навет ня толькі з ім, але і з усімі, як казаў пісар, „сільнымі міра сего". Падпісваў земскаму рахункі, у якіх будова маста ля Глінӑўкі цанілася 1500 руб., рамонт шасы да м. Будзілава—3.500 руб., хоць добра ведаў, што мост больш за тысячу не каштаваў, а шаса—найбольш 2 500.

— Не маё гэта дзела — думаў Дзяцел, ачышчаючы свае сумленьне. Але затое і яму рэдка заглядалі ў кнігі, а калі і рабілі гэта, дык толькі дзеля формы.

Пайшло ўсё, як па масьле. Будавалі ля мястэчка школу, сяляне пастаўлялі лес, цэглу, вапну—сотні фурманак прыганялі старасты, але з багацейшых ніводнага там ня можна было ўбачыць. Беднякі бунтаваліся.

— Чаму кулак Хведар ня едзе? Чаму паноў ня гоніш, у іх-жа коні, як зьвяры?!— і прабавалі то-ж ня ехаць, але старшыня штрафаваў іх за гэта, ці садзіў у халодную.

Школу збудавалі, але адначасна зладзіў сабе пекны дамок і старшыня ў мястэчку; сяляне гаварылі, што лес, з якога ён быў збудаваны, вельмі падобны да таго, які яны пастаўлялі на школу. На пісара ўжо скардзіцца даўно перасталі, бо-ж Дзяцел зрабіўся ня лепшы за яго: якоесь пасьведчаньне ці пашпарт трудна было атрымаць, хіба завязеш з мястэчка воз гною на Янкаў хутар.

Так праляцела ўжо блізка тры гады. Дзяцел разбагацеў, задзіраў нос і не хацеў знацца з „мужыкамі". Пан, не чапай яго! Сяляне каяліся, як бітыя, што выбралі такую „цацу".

— Здраднік, казалі, бач як надуваецца, а калісь як пекна пяяў—жалеў нас! Пажалеў, каб ён здох! Удвая горшы за папярэдняга стаўся! Каб толькі скарэй дачакаць перавыбараў—пагонім яго к чорту!

— Дахадзіла гэта да вушэй ужо „пана" Дзятла. Стаў ён аб гэтым падумваць, ды рабіць загадзя перадвыбарныя „хады". Старастам прыбавіў пэнсіі, часта іх частаваў, няпэўных аддаляў, багацейшым рабіў усялякія палёгкі, з многімі з іх пакуміўся, парадніўся, езьдзіў ён і яны да яго ў госьці — такшто ў апошні час меў шмат верных сабе кумпаноў.

П. Асака.

(Канец будзе).

валюцыі, калі сталі ў вагні панскія двары, а тысячы людзей расстрэлівалася, ці думаеце, што гэта выключна за іх віны?

Не, то і за віны іх продкаў, іх дзядоў і бацькоў разам.

І гэты ўчынак вам дасьць свае вынікі. Вы кідаеце рукавіцу пралетарыяту, — гэта рукавіца будзе паднята.

Калі вы здолееце выгнаць адсюль Сахацкага, дык куды-ж вы выжанеце сотні тысячаў выбаршчыкаў, каторыя яго сюды паслалі?

Гдзе вы іх дзенеце?

Пасол Сахацкі прышоў сюды бараніць не свае ўласныя інтарэсы, а інтарэсы сваіх выбаршчыкаў, спаўняць іх волю.

Мусіце з гэтым лічыцца.

Вас тут ёсьць больш, а нас прадстаўнікоў працоўных масаў менш. Але прымеце-ж пад увагу, што нашых выбаршчыкаў ёсьць цэлыя масы, мільёны, і яны некалі зажадаюць ад вас адказу: Што зрабілі з прадстаўнікамі працоўных?

Факт выдачы пасла Сахацкага ёсьць далейшым ланцугом тых гвалтаў над прадстаўнікамі працоўных масаў, каторыя мелі месца больш году таму назад, калі заарыштавалі і выдалі нашых паслоў Тарашкевіча, Мятлу, Р.-Міхайлоўскага і інш.

Іх таксама выдалі, і цяпер іх судзяць за тое, што служылі яны не сваім уласным інтарэсам, а інтарэсам свайго працоўнага народу. Не яны стварылі грамаду, а народная грамада вырабіла іх.

Таксама не пас. Сахацкі тварыў гэтыя пласты камуністычныя, як вы кажаце, але яны яго стварылі. (Голас: Пан ставіць новае мяркаваньне. Другі голас: Расейскія даляры яго стварылі).

Высокая Палата! Я яшчэ раз голасна пратэстую ад імя працоўных гушчаў Беларусі проці ўсіх актаў надужыцьцяў над тым працоўным народам, проці выданьня б. паслоў Тарашкевіча, Р.-Міхайлоўскага, Мятлы і Валошына і супроць суду над гэтымі героямі, нашымі абаронцамі і мучанікамі за нашую справу.

Таксама выказваюся проці выданьня п. Сахацкага.

А можа знойдзеце яшчэ ў сябе грамадзкага сумленьня, хаця-ж трудна нам у тое верыць.

Рэзультаты выбараў у Нямеччыне.

20 траўня адбыліся ў Нямеччыне выбары, дый ня толькі ў нямецкі парлямант — агульна-дзяржаўны, але і ў цэлы сьцяг соймаў паасобных „дзяржаўных зямель“, складаючых Нямецкую Саюзную Дзяржаву.

Як цьвердзяць мясцовыя наглядчыкі, бой адбываўся галоўным чынам паміж 2-х найвялікшых партыяў Нямеччыны: сацыял-дэмакратыяй і нацыяналістамі. — Рэзультаты бою далі бясспрэчную і значную перамогу сацыялістам. Нямецкая эндэцыя пабіта, можа, ня так, як польская, але ў кожным разе вельмі цяжка. Нямецкія нацыяналісты накруг страцілі 30 прац., ці каля трацiны галасоў, тады як сацыялісты (разам з камуністамі) ў цэлым сьцягу акругоў павялічылі лічбу здабытых галасоў удвая, дый пераважна—коштам нацыяналістаў.

Ніжэй падаем табліцу складу новага парляманту ў параўнаньні з старым:

	Мелі ў старым парлям.	Здабылі ў новым
Сацыял-дэмакраты . .	131	152
Нацыяналісты	111	73
Цэнтр	63	63
Камуністы	45	54
Людоўцы Штрэзэмана	55	44
Дэмакраты	32	25
Гаспадарчая партыя .	—	23
Гітлераўцы, манархісты-фашысты . . .	11	12
Сялянская партыя . .	—	8
Дробныя групы . . .	—	19

Агульная лічба паслоў новага Рэйхстагу 489.

Паводле нямецкага выбарнага закону—лічба паслоў парляманту—не зафіксавана, як сталая, але павялічваецца—з узростам насяленьня:—на кожныя 60 тысяч галасоў прыпадае 1 мандат.

Галоўным фактам у гэтай зьмене складу парляманту зьяўляецца немагчымасьць тэй цэнтра-правай коаліцыі, якая існавала ў ім ад часу апошніх выбараў.

Бо-ж—у папярэднім парляманьце абодва крайнія флянгі: сацыялістычна-камуністычны і нацыяналістычны ўзаемна зраўнаважвалі адзін аднаго, даючы вольную руку цэнтравым фракцыям выбіраць паміж імі таварышоў урадавай коаліцыі, у новым парляманьце — разгром правага флянгу зрабіў ужо немагчымым гэты вольны выбар: камандзірам палажэньня ў парляманьце зьяўляюцца сацыялісты, якія разам з камуністамі складаюць амаль не палову яго. Такім чынам новая ўрадавая коаліцыя ў парляманьце можа быць толькі цэнтра-левая, калі навет ня чыста левая... Нацыяналісты, ня кажучы ўжо аб крайніх правых (як гітлераўцы, баварская „народная партыя“ і інш.) — пяройдуць у апазіцыю.

Сацыялісты здабылі 9 мільён. 111 тысяч зьлішкам галасоў. Камуністы 3 мільёны з чвэрцяй. Такім чынам усе гутаркі аб заняпадзе нямецкага камунізму аказваюцца перадчаснымі. Нацыяналісты атрымалі толькі 4 мільён. 359 з паловай тыс. галасоў.

З такога агульнага настрою нямецкага народу вынікае перадусім, як галоўны агульны вывад, — аб заняпадзе манархічнай ідэі, але наадварот—аб узмацненьні рэспубліканскіх настрояў у Нямеччыне.

А гэта, з другога боку, яўна сьведчыць—аб узмацненьні ў краі імкненьняў да міру, які, як ведама, значна лепш гарантуе рэспубліканскі лад, як манархічны. Гэтае зьявішча наглядчыкі тлумачаць перадусім—паразуменьнем з Францыяй і Англіяй, якое дае магчымасьць Нямеччыне мірнымі шляхамі вырашаць задачы сваей замежнай палітыкі, ня кажучы ўжо аб тым, што насяленьне на ўласным дасьледзе выпрабавала перавагу рэспубліканскага ладу над манархічным. Але гэтая перавага міратворчых партыяў — з сацыялістамі ўсялякага роду на чале — дасьць магчымасьць прышламу ўраду найбольш рашуча высунуць тую праграму, якую нямецкі народ сваімі выбарамі паставіў становуча на чаргу дня, як неадкладную ў галіне міжнароднай палітыкі. Гэтая праграма выражана асабліва моцна і выразна ў выбарнай плятформе нямецкага сацыялізму, які—рашуча адмаўляючыся ад лёзунгу ваеннага рэваншу (адабраньня сілай нямецкіх зямель, аддадзеных саюзьнікамі суседзям), высоўвае трэбаваньні безадкладнага ўрэгуляваньня мірным шляхам перагавораў — наступных справаў:

1. Канчальнае ачышчэньне нямецкай зямлі ад усялякай акупацыі;

2. Злучэньне Нямеччыны з Аўстрыяй;

3. Зварот Нямеччыне абшару Саары;

4. Агульнае разбраеньне — суадказна разбраеньню Нямеччыны;

5. Перагляд справы адшкадаваньняў („пляну Доўса“);

6. Перагляд тэрытарыяльных пастановаў Вэрсальскага Трактату (справа польска-нямецкай граніцы).

Такім чынам, новая фаза паразуменьня паміж Нямеччынай і Францыяй будзе тварыцца цэнтра-правым урадам францускім і цэнтра-левым нямецкім.

Характэрнай адзнакай апошніх выбараў у Нямеччыне зьяўляецца поўны правал на выбарах нацыянальных меншасьцяў: ані водная з іх не здабыла мандату, ня гледзячы на тое, што разам яны ўсе, на чале з лічнейшай—польскай—сабралі каля 70.000 галасоў. Цікаўна, ці гэты факт змусіць нямецкую ўладу спыніць, ці прыпыніць тое рашучае развязаньне меншасьцявай праблемы, якое распачаў прускі ўрад. Калі спыніць, дык значыць пададзены ў прэсе і гучна рэкламаваны акольнік прускага ўраду быў толькі выбарным манэўрам...

З Сойму.

23 г. месяца разглядаўся ўрадавы праект падаткаў: маемаснага, грунтовага і будынковага.

Першы падатак — маемасны — належыцца да абшарнікаў, і ніякага абцяжэньня ім бы ня прынёс, а толькі палёгку, бо па гэтаму праекту маемасную платнасьць устанаўляла бы 4 ўрадоўцаў з „Izby Skarbowej“ разам з 8 прадстаўнікамі плацельшчыкаў. Апрача гэтага, гэты праек касуе нявыплачаныя падатковыя залегласьці, калі-б Сойм яго не адкінуў.

Другі ўрадавы праект—грунтовы падатак ложыцца сваім цяжарам пераважна на бедных сялян, бо па гэтаму праекту селянін плаціў-бы ў некалькі разоў больш, як цяпер плаціць.

Трэці ўрадавы праект — падаткі ад жылога будынку, які-б ён ня быў, прасьцей сказаць, ад коміна. Па гэтым законе селянін плаціў-бы за сваю цякучую хату, а то і за зямлянку, столькі-ж, сколькі і пан абшарнік за свой палац.

Калі-б гэтыя праекты прайшлі ў Сойме, то селянін у цяперашняй бядзе быў-бы ападаткаваны, як вылічыў пасол Шыдлоўскі, у 4 разы больш.

Гэтую немагчымасьць і цяжкую крыўду селяніна, як наагул і ўсякага працоўнага, пачалі бараніць запраўдныя сялянска-работніцкія паслы, дамагаючыся пералажэньня падаткавага цяжару на багатыяклясы.

Вынікам галасаваньня было адкіненьне будынковага падатку 191 галасамі проці 149, а грунтовага падатку 195 проці 146.

Па аб'яўленьні рэзультатаў галасаваньня, міністар Чэховіч падыйшоў да Маршалка Сойму і аб'явіў, што ўрад забірае (wycofuje) і трэці падатак. Потым мін. Чэховіч сказаў прамову, у якой гаварыў, што гаспадарка Польшчы, што дальш, то ўсё больш робіцца ад'емнай, і што адкіненьнем гэтых праектаў Сойм дужа затрудняе яе разьвіцьцё, бо няма чым пакрываць недахопы...

Пас. Гаўрылік Клюбу „Змаганьне“ ўнёс экстарны ўнёсак у справе забойства дзьвюх асобаў паліцыянтам у Маладэчне, падпісаны 50-ю пасламі. Але ў п. Маршалка Дашынскага асаблівая міласьць да ўнёскаў гэтага клюбу. Унёсак астаўся экстарным аж на наступнае паседжаньне. Маршалак ня даў голасу ў гэтай справе і не паставіў ўнёску на парадак дня.

Наступнае паседжаньне Сойму адбудзецца ў аўторак 29 гэтага месяца.

На парадку дня: чытаньне бюджэтнага прэлімінажа на 1928 — 1929 год і некалькі нашых унёскаў.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Польска-літоўская канфэрэнцыя ў Варшаве.

Ад 21 г. месяца у Варшаве адбываецца польска-літоўская канфэрэнцыя ў справе эканоміі, транзыту і камунікацыі.

Першы дзень пачаўся і кончыўся прамовамі дзьвюх старон.

У другім дні адбыліся дыскусіі ў эканамічных і транзытных справах і ўсталены інструкцыі для падкамісіяў.

Вечарам старшыня польскай дэлегацыі Шумякоўскі частаваў абедам літоўскую дэлегацыю. У тым-жа часе экспэрты польскай дэлегацыі частавалі абедам экспэртаў літоўскай дэлегацыі.

Кульганьне польскага гандлю.

Па тымчасовым аблічэньням Галоўнага Статыстычнага Ураду недахоп у польскім гандлёвым білянсе за красавік раўняецца 81,105,000 злотых. У параўнаньні з сакавіком прывоз зьменшыўся на 106,606,000 зл., а вываз на 23,894,000 злотых.

Як бачым, дык гэтае кульганьне пераходзіць у хранічнае.

Вялікая шпігоўская „afera“ ў Польшчы.

Газэты падаюць сэнсацыйныя весткі аб вялікай, небясьпечнай шпігоўскай арганізацыі ў Польшчы, якую ўтрымлівала „пэўнае пасольства“ суседняй дзяржавы ў Варшаве.

Заданьнем гэтай арганізацыі, кажуць газэты, быў дакладны жалезнадарожны вывед на ўсходніх абшарах польскай дзяржавы. З гэтай мэтай гэтая арганізацыя набірала (werbowała) жалезнадарожных урадоўцаў, маючых ў сваім распараджэньні агульны плян жалезнадарожнай мабілізацыі ў часе вайны. Гэтай акцыяй кіраваў нейкі дыплямат Вінаградаў праз Кракаў, па весткам газэт, дзеля таго, каб гэтым забясьпечыць пасьпех сваей працы. З такой мэтай дыпл. Вінаградаў вышукаў у Кракаве нейкага Станіслава Турка, старшага асыстэнта ўраду руху ў кракаўскай жалезнадарожнай дырэкцыі, праз якога і кіраваў усім. Упамянуты жалезнадарожны ўрадовец Турак, браў частыя одпускі і разьяджаў (бясплатна) па розных жалезнадарожных дырэкцыях, заяжджаючы да гэтага дыплёмата ў пасольства, што і было прычынай арышту Турка.

Арыштаваньне за шпігоўства ў Роўне.

Газэты падаюць аб яшчэ адным сэнсацыйным арыштаваньні за шпігоўства, а іменна, аб арышце ў Роўне нейкага Руніча. Як кажуць газэты, Руніч быў калісь шэфам чрэзвычайкі ў Адэсе. Перад вайной-жа быў артыстам і фільмавым рэжысёрам, дзе і праславіўся, як геніяльны выканаўца ў багатырскіх ролях расейскіх фільмаў, на якіх выступаў разам з шырока праславіўшайся артысткай Верай Халоднай. Нядаўна-ж (падаюць газэты) Руніч прыехаў у Польшчу па сэрбскім пашпарту і жыў у Роўне, дзе выступаў у тэатры.

Пагроза будаўлянай забастоўкі ў Лодзі.

Як падае „Rzeczposp.“ № 146, у Лодзі адбылася сходка сяброў будаўлянага саюзу і работнікаў, належачых да „Гасподы муляроў, плотнікаў і сталяроў“, дзе наражаліся над адкіненьнем будаўлянымі прамыслоўцамі жаданьняў работнікаў. Па доўгай дыскусіі настаноўлена прыступіць да забастоўкі, пакідаючы ўраду саюзу час яе абвяшчэньня.

Пры гэтым пастаноўлена пашырыць забастаўку ў будаўляным промысьле на ўсе пакрэўныя спэцыяльнасьці.

Пагроза страйку ў манаполі.

На апошнім сабраньні работнікаў сьпіртовага прамыслу ў Лодзі пастаноўлена зажадаць ад цэнтральных уладаў выраўнаньня заработнай платы і велічы прадуктыўнасьці работы з работнікамі сьпіртовага прамыслу ў Варшаве. Калі-ж у найбліжшых днях жаданьні работнікаў ня будуць заспакоены, работнікі пастанавілі прыступіць да забастоўкі.

Сэнсацыйны прыгавар.

У трыбунале прысяжных у Новым Сончы закончыўся працэс проці 2-х лясьнічых, за надужыцьці у лясох пад Закапаным. Надужыцьці перавышалі суму 25.000 злотых. Трыбунал аднаго з іх засудзіў на 14 дзён арышту, а другога ўнявіньніў. (Rzeplita № 145).

Гэта дык праўдзівы „цуд“!

Заграніцай.

Ген. Фэнг у Пэкіне.

У Маскве атрымана вестка, быццам ген. Фэнг ужо заняў прадмесьце Пэкіну. Эвакуацыя Цянь-Дзіну адбываецца ўдзень і ўночы. Чужаземныя фірмы нясуць з прычыны гэтага вялізарныя страты. Эўрапэйскія атрады ў Цянь-Дзіне рыхтуюцца да абароны чужаземнага раёну места.

Японія хоча акупаваць Манчжурыю.

Японскі ўрад, як даносіць англійская прэса, заявіў, што — маральны стан і дух войскаў Чанг-Тсо-Ліна — настолькі дрэнны, што вытрымаць націску паўдзённых арміяў яны зусім нyздольныя. Дзеля таго гэтыя войскі нyздольныя будуць абараніць Манчжурыю, калі адступяць туды, пакінуўшы Пэкін і Цянь-Дзін.

Дык тады Японія бярэ на сябе цалком абавязак абароны Манчжурыі, дзеля чаго вышле туды столькі войска, сколькі будзе патрэбна. Калі-ж паўдзённыя арміі спрабуюць насунуцца ў Манчжурыю, дык японскія войскі будуць разьбіваць іх. Японскае галоўнае камандаваньне — гатова супрацоўнічаць з чужаземнымі вайсковымі ўладамі ў Манчжурыі, але — „не дапусьціць іх да ўмяшацельства ў сваю манчжурскую палітыку“ (дадай: захвату краю).

З гэтага відаць, што Японія ўжо цалком лічыць Манчжурыю „сваім краем“. Ці дазволяць аднак-жа на гэта СССР, Амэрыка і іншыя дзяржавы, пабачым. А перадусім,— ці згодзіцца на гэта сам гаспадар кітайскай зямлі—народ.

Гаспадарчы байкот Японіі.

Кантонская гандлёвая палата выдала адозву, заклікаючую кітайскі народ да разрыву ўсялякіх гаспадарчых стасункаў з Японіяй. Такую-ж адозву выдала і шанхайская гандлёвая палата, саюз шанхайскіх вулічных гандляроў і інш. Газэты, надрукаваўшыя адозвы, горача заклікаюць да агульнага байкоту Японіі, які павінен быў распачацца 15-га траўня.

Чанг-Тсо-Лін баіцца Японіі.

Чанг-Тсо-Лін, якога Японія маніцца ратаваць проці паўдзённых арміяў, сам ня менш баіцца Японіі, як гэтых кітайскіх арміяў. Ён зьвярнуўся да японскіх уладаў—з „запытаньнем“, — якія мэты мае Японія ў Манчжурыі...

Хай пачакае, пакуль атрымае адказ... З Масквы даносяць, што Японія ўжо мае нагатове 16.000 атрад для высылкі ў Манчжурыю.

Місія Бэнэша ў Бэрліне.

Нямецкая прэса піша, што мэтай пабыту мін. Бэнэша ў Бэрліне зьяўляецца нахіленьне Нямеччыны да ўчасьця ў праектаваным чэха-славацкай дыпляматыяй (францускай...) „наддунайскім саюзе дзяржаваў сярэдняй Эўропы“, да якога мела-б належаць таксама і Аўстрыя. Гэты плян скіраваны адначасна проці саюзу Італіі з Вэнгрыяй і проці злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай. Дык нямецкая прэса сьцьвярджае, што місія Бэнэша згары засуджана на непасьпех.

Парыжская прэса афіцыяльна запярэчвае, быццам Бэнэш мае якую спэцыяльную місію ў Бэрліне.

Францыя згадзілася на прапазіцыю Кэллога.

Адна з францускіх газэтаў даносіць, быццам францускі ўрад згадзіўся на праэкт мін. Кэллога (ў справе трактату „вечнага міру“) — у тым тэксьце, на якім настайвае амэрыканскі ўрад (які, як ведама, адкінуў усе францускія папраўкі). Цяпер францускі ўрад трэбуе толькі, каб да трактату быў далучаны асобны „пратакол“, зацьверджаны ўсімі вялікімі дзяржавамі, у якім былі б зьмешчаны ўсе францускія папраўкі і тлумачэньні.

Цікаўныя праекты зьмены югаслаўскай канстытуцыі.

Белградзкая прэса даносіць, быццам югаслаўскі міністар заграцічных спраў Марынкавіч мае запрапанаваць перагляд канстытуцыі Югаславіі — у напрамку значнага пашырэньня ролі Харватыі і Славеніі ў югаслаўскай дзяржаве.

Югаслаўскі наступнік трону меў-бы тытул „харвацкага бана“, мелі б быць адбудаваны аўтаномныя соймы Харватыі і Славеніі. Места Загрэб мела-б быць зроблена другой сталіцай Югаславіі.

Як ведама, уся барацьба югаслаўскай апазіцыі вядзецца перадусім—проці цэнтралістычных і нацыяналістычных імкненьняў сэрбаў і—за справядлівае раўнапраўе двух другіх краёў, злучаных у адзінае „Каралеўства Сэрба-Харвата-Славенію“. Як відаць, маючы мэтай умацаваць дзяржаву, югаслаўскі ўрад, у якім ужо значную ролю пачалі йграць харваты і славенцы, ідзе на важныя і прынцыповыя ўступкі.

Адказ Альбэра Тома.

Жэнэўская прэса зьмяшчае адказ Альбэра Тома на абураныя галасы сацыялістычнай прэсы—з прычыны яго заяваў на фашыстаўскім кангрэсе ў Рыме. Альбэр Тома піша, што — сьмешна навет думаць, быццам ён — прыхільнік фашызму. Наадварот, ён — заўсёды верны ідэям сацыялізму. Падарожжа яго ў Рым мела мэтай толькі дасьледзіць на месцы „сацыяльныя здабычы італьянскай дзяржавы, якая зьяўляецца сябрам Міжнароднага Бюро Працы“. Але тав. Тома ня кажа аб тым,—ці ён выхваляў гэтыя „здабычы“ фашызму, ці не. Але-ж тав. Адлэр абураецца ня проці таго, што А. Тома інфармаваўся ў Рыме аб гэтых здабычах, але проці таго, што ён пяяў на кангрэсе гімны фашызму...

Вось, як робяць „сацыялісты“ Тома!

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Наша хроніка.

Экзаміны дасьпеласьці ў Віл. Бел. Гімназіі. Шляхам доўгай перапіскі і вусных перагавораў з Міністэрствам Асьветы і Віленскім Куратарыумам В. Б. Гімназія дастала паперку, з якое можна судзіць, што пры вызначанай Куратарыумам Камісіі з прадстаўнікоў пэрсоналю гімназіі і спэцыяльна вызначаных экзамінатараў — адбудуцца экзаміны дасьпеласьці ў беларускай мове з выняткам прадметаў полёністыкі, якія адбудуцца ў польскай мове. Здаўшыя экзаміны будуць мець правы, роўныя з матурыстамі дзяржаўных гімназіяў.

Агульны сход Т-ва Помачы Пацярп. ад вайны. Камітэт помачы пацярпеўшым ад вайны гэтым паведамляе ўсіх сваіх сяброў, што дня 31 траўня г. г. у памешканьні Віленскай Беларускай Гімназіі (Вострабрамская 9) у 6 гадзін увечары адбудзецца Агульны Сход усіх сяброў Камітэту.

Павестка дня: Перадача Беларускаму Дабрадзейнаму Т-ву ўсіх функцый і маемасьці Камітэту помачы пацярпеўшым ад вайны.

У выпадку, калі ў 6 гадзін не зьбярэцца патрэбны для кворума лік сяброў, паседжаньне адбудзецца праз гадзіну (ў 7 гадз. увечары) і будзе лічыцца правамочным пры ўсялякім ліку сяброў **Урад Камітэту.**

Пастанова віленскіх пекароў. Віленскія пекары пастанавілі энэргічна дамагацца ад сваіх працадаўцаў 8 гадз. дня працы. Па іх абліччэньнях, 8 гадз. дзень працы пекароў, зьліквідуе безрабоцьце сярод пекарняных работнікаў.

Суд над „Грамадаўцамі" ў Вялейцы. Ад 11-га да 14-га гэтага месяца адбываўся ў Вялейцы суд над „Грамадаўцамі", (у ліку 21 чалавек), якія абвінавачываліся з 102 арт. К. К. Абвінавачаныя наступныя: Ал. Рыжы, Пётра і Сьцяпан Рэўцы, В. Кіслы, К. Морскі, П. Шаўлевіч, Сьліж, Шаўлюк, Г. Родзевіч, Сяргей і Якуб Канапелька, Г. Бублічэнка, Н. Шаўлюк, Б. Морзак, М. Шакуль, Трос, Каранік, Казакевіч, і іншыя.

Абвінавачваў прак. Сасноўскі, баранілі адв. Андрэеў і Альпэр. Суд засудзіў усіх з арт. 102. Трох на 3 гады цяжкага вастрогу, 7 на 2 гады цяжкага вастрогу, 1 на 1 год цяж. васт., а рэшту на 1½ гады крэпасьці.

Абвінавачаныя ўжо прасядзелі больш, як па году.

Жаданьне падвышкі. Работнікі віленскіх спажывецкіх закладаў зажадалі ад сваіх працадаўцаў 25 прац. падвышкі.

Клясычны прыклад „маральнай санацыі" сярод польскіх культурна-прасьветных урадоўцаў на „крэсах". Манархістычнае „Słowo" ў 113 N-ры падае надзвычайна агідны падлог-факт, зняволеньня беларускіх дзяцей—дзяўчынак, да якога дапусьціўся польскі вучыцель — „галілейчык", якія ў нас і зьяўляюцца пераважна вучыцялямі.

Факт гэты віленская газэта падае так: „Зброднічы чын вучыцеля.

„Управял нежонд (якое малазначачае, амаль нявіннае слова!)" з школьнымі дзяўчынкамі.

„З распараджэньня адпаведных уладаў астатнімі днямі арыштаваны, у Балецкішках Лідзкага павету, некі Мэнліх, вучыцель тутэйшай „паўшэхнай школы", паходзячы з Галіцыі. Арыштаваны ён пад закідам „uprawiania nierządu" (які, амаль не нявінны закід! —Рэд.) з малалетнімі школьнымі дзяўчынкамі.

У гэтай справе нас інфармуюць, што Мэнліх жанаты і мае 2 дзяцей, зняволіў (zgwałcił) 6 маладых дзяўчынак у веку ад 12 да 14 гадоў.

Гэтага ганебнага ўчынку Мэнліх дапусьціўся тым спосабам, што затрымліваў пасьля лекцыяў быццам за кару свае ахвяры ў школе, або высылаў іх на гару (strych), дзе мясьціўся школьны архіў і там іх гвалціў.

Яго зброды выявіў вучань гэтай-жа школы, які, чакаючы пасьля лекцыяў на затрыманую вучыцелям сястру, падглядаў праз вакно да клясы, дзе ўбачыў, як вучыцель зьдзекаваўся, гнушаўся (pastwił się) над сваей ахвярай.

Хлапец пабег да хаты за некалькі кілямэтраў і расказаў усё бацькам.

Калі бацькі запыталіся ў дзяўчынкі аб гэтым, дык яна ў першай хвілі баялася прызнацца. Але адданая пад аглядзіны доктара — расказала ўсё падрабязна.

Зробленае сьледзтва даказала, што Мэнліх практыкаваў (wykonywał) свае зброды ўжо даўно і што „пашкадаваных" ёсьць 6 дзяўчынак, (як-бы тут ходзіць аб якую то дробную матэр'яльную шкоду — Рэд).

Вось якую высокую, сьветлую, паступовую аж да „рэваляцыі" культуру Захаду нясуць цёмным „зацафаным" „Крэсам усходнім" галілейскія вучыцялі, у той час, як прафэсараў беларускіх польская пракуратура называе „барбажынцамі".

Забастоўка ў фабрыцы жалеза ў Беластоку. У фабрыцы жалезных вырабаў Ашкеназе выбухла забастоўка. Работнікі жадаюць 30 проц. падвышкі.

Забастоўка драўляных работнікаў. У драўляных закладах гданскага сэнатара Евелёўскага ў Зардэлях, Нясьвіжскага павету, выбухла забастоўка. Прычына забастоўкі — затрыманьне выплаты работнікам 100 тысяч залеглай платы. Бастуе каля 100 работнікаў.

Забастоўка ў Белавежы. Забастоўка ўсіх умысловых і фізычных працаўнікоў на лесапілках у Белавежы прадаўжаецца. Бастуючыя жадаюць ад 30 да 40 проц. падвышкі для ўмысловых працаўнікоў і ад 30 да 35 проц. для фізычных працаўнікоў. Бастуе больш як 12.000 чалавек.

З Т-ва Бел. Школы.

Арганізацыя Акружн. Управы ў Глыбокім.

6 траўня 1928 году адбыўся агульны сход сяброў Т-ва Беларускае Школы дзеля перавыбараў Акружнае Управы. Прысутных было болей 40 асоб, з правам рашаючага голасу 22 асобы, якія мелі пры сабе сяброўскія білеты. Пасьля справаздачы аб працы Акружнай Управы, зробленай гр-нам Аніськовічам Янкай, было прыступлена да выбару Акружнай Управы, у склад, якой увайшлі: Аніськовіч Янка—старшыня, Багдановіч Мікалай—віцэ-старшыня, Сяргей Майсяёнак —скарбнік, яго заступнік—Фэлікс Квач; на сэкрэтара выбраны—Фэлікс Яркавец, заступнікам яго—Цяліца Сяргей.

Даклад аб працы Т-ва зрабіў прадстаўнік Галоўнай Управы гр. Рыгор Шырма, які ў сваей прамове высьвятліў мэты і заданьні Т-ва, як у справе школьніцтва, так і ў справе пазашкольнай асьветы, асабліва для вясковай моладзі.

Даклад гр-на Шырмы быў прыняты з вялікім задаволеньнем агульным зьездам Глыбоцкага Т-ва, ад імя якога дзякаваў Галоўную Управу ў асобе яе прадстаўніка старшыня сходу Аніськовіч.

Праца Гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

× Вёска Пяшчанікі, Беластоцкага павету. 16.IV 28 г. у в. Пяшчанікі адбыўся спэктакль вечарына. Пастаўлена была п'еса Я. Купалы — „Паўлінка". Артысты згулялі свае ролі добра і публіка задаволілася тым, што бачыла перад сабою.

Ня гледзячы на тое, што ішоў дождж, глядзельнікаў было шмат.

Даход у суме 70 зл. пайшоў на мэты культурна-прасьветныя.

× М-ка Казлоўшчына, Слонімскага павету. У нядзелю 22-га красавіка ў м-ку Казлоўшчына Г-ком Т-ва Беларускае Школы быў наладжаны спэктакль-вечарына. Ставілі: „Заручыны Паўлінкі" — Аляхновіча і „Лекары і лекі" — Гаротнага. Наагул спэктакль прайшоў жыва. Асабліва мастацка была ўпрыгожана саля. Даход пашоў на карысьць пагарэлых у в. Скіпоравічы, Казлавецк. гм.

× М-ка Цырын, Наваградзкага павету. Цырынскім Г-ком Т-ва Бел. Школы былі наладжаны наступныя спэктаклі:

1. У в. Малюшыцах 8.I 28 г. — „Страхі жыцьця" і „Моды шляхцюк".
2. 19.I 28 г. у м-ку Цырыне — „Антось Лата" і „Стараста".
3. 3.II 28 г. у вёсцы Падгайна — „Заручыны Паўліні" і „Чорт і баба".
4. 16.IV 28 г. у вёсцы Падгайна—„Паўлінка" і „Боты".
5. 22.IV 28 г. у вёсцы Катаўшчыне — „Птушка шчасьця" і „Боты".

Ад Мірскае Акружнае Управы Т-ва Бел. Школы.

Мірская Акружная Управа гэтым шчыра дзякуе за ахвяры на бібліятэку-чытальню пры Народным Доме Т-ва Бел. Школы у м. Міры: братом-беларусам з Амэрыкі гр. м. Міра Пятру і Яну Лабоцкім за 10 даляраў і б. паслу Юрыю Сабалеўскаму за 20 злотых. За будову бібліятэчнае шафы для бібліятэкі-чытальні, грам.: Міхасю Русецкаму, Паўлу Саковічу, Аляксандру Дзянісу і Сьцяпану Атцэцкаму. За дошкі на бібліятэку-чытальню — сябром: Мірскага, Анцэўскага, Возерскага і Вераженскага Гуртка Т-ва Бел. Школы. За будову лавак для бібліятэкі-чытальні — сябру Саковічу Паўлу.

**Мірская Акружная Управа
Т-ва Бел. Школы.**

Павятовы зьезд сяброў Т-ва Бел. Школы Вялейскага павету.

Вялейскі павятовы зьезд сяброў Т-ва Бел. Школы адбыўся 13.V 1928 г. Прысутных з правам рашаючага голасу 89 асоб. Выступіўшаму з прывітаньнем гр-ну Уласаву, старшыні Галоўнае Управы, прадстаўнік староства забараніў прамаўляць, паклікаючыся на тое, што ў яго няўпісаны ў парадак дня прывітаньні. Пратакол папярэдняга сходу ня мог быць зачытаны з тэй прычыны, што ўсе кнігі і рахунковасьць Акружнае Управы забраны старостваm. Справаздачу аб дзейнасьці Акружной Управы зрабіў старшыня яе, пасол на Сойм Ф. Валынец, які занятпад у працы тлумачыў вельмі тэндэнцыйнымі адносінамі мясцовай улады да Т-ва. Прамова пасла Валынца была перарвана прадстаўніком старасты, рэфэрэнтам карным п. Клюбэрам.

Пасьля дакладу ад Нагляднае Рады і дакладаў з мейсц прадстаўнікамі ад паасобных гурткоў, прыступлена да выбараў Акружнае Управы, у склад якой увайшлі: пасол Валынец — старшыня, Усьціновіч — сэкрэтар, В. Субач — скарбнік, Я. Качаргін і С. Пагуда — віцэ-старшыні, М. Завадзкі — заступнік сэкрэтара і Зьм. Лаўрыновіч — заступнік скарбніка; у Наглядную Раду выбраны: Я. Субач, Зьм. Жоўтка і П. Гаўрылік.

У справе адбудовы Народнага Дому зрабіў даклад пасол Валынец; прычынамі, якія не даюць магчымасьці распачаць будову, зьяўляюцца перашкоды, стаўляныя з боку ўлады. Усьціновіч Юры высьвятляе патрэбу складаньня што-год школьных дэкларацыяў, якія толькі й дадуць магчымасьць мець сваю родную школу, а таксама зьвярнуў увагу на патрэбу адчыненьня Беларускай Гімназіі ў Вялейцы, на месца хілячайся да заняпаду Расейскай і прапануе сходу, прасіць пасла Валынца заняцца гэтай справай.

Прадстаўнік Галоўнае Управы Р. Шырма ў гарачай прамове акрасьляе плян працы Т-ва на будучыню: 1) змаганьне за родную школу, на права мець якую стаіць за намі навука і закон; 2) зьвярнуць увагу, побач з правядзеньнем у масы культуры, на маральнае ўзгадаваньне моладзі, а дзеля гэтага 3) закладаць Народныя Дамы і бібліятэкі-чытальні. У далейшым высьвятленьні працы Т-ва грам. Шырма быў спынены прадстаўніком адміністрацыі.

У бягучых справах сябра Ул. Нехвядовіч ад імя ўсяго зьезду прыносіць шчырую падзяку папярэдняй Управе за яе карысную працу.

На заканчэньне Ф. Валынец у гарачых словах заклікае да дружнай і супольнай працы над падняцьцем культуры свайго народу і прапануе наступную рэзалюцыю 3 зьезду Акружнае Управы Т-ва Бел. Школы ў Вялейцы ад дня 13.V 1928 г.:

3-ці Акружны зьезд сяброў Т-ва Бел. Школы, выслухаўшы справаздачу ад Галоўлоўнае Управы, Акружнае Управы і ад Гурткоў аб палажэньні асьветы сярод беларусаў, канстатуючы няпрыхільныя адносіны мяйсцовых уладаў, перашкоды, якія чыняцца на шляху зьдзейсьненьня мэтаў Т-ва і дамаганьня роднае школы, пратэстуючы проці варожай акцыі ўладаў да пашырэньня нацыянальнай сьвядомасьці Беларускага Народу праз родную школу і асьвету—пастанаўляе:

1) Дамагацца поўнага стасаваньня языковае ўставы з 31.VII 1924 г. і распараджэньня Міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы з дня 7.I 1925 году.

2) Сцьвярджаючы патрэбу для дзіцяці роднай школы, даведзеная праз корыфэяў пэдагогікі (Каменскі, Пасталоцьці, Ушынскі і інш.) зьезд адначасна дамагаецца зьмены некарысных пунктаў для беларускай школы, вышэй названай уставы і зьліквідаваньня ўтраквістычных школ.

3) Дамагацца назначэньня ў беларускія пачатковыя школы вучыцялёў-беларусаў.

4) Дамагацца адчыненьня беларускіх вучыцельскіх курсаў і беларускай сэмінарыі на кошт ураду.

5) Дамагацца адчыненьня Беларускай Гімназіі ў Вялейцы, наданьня матуры ўсім прыватным беларускім гімназіям і субсыдый ад ураду на сярэднія школы.

6) Сцьвярджаючы факт дапамогі ўладаў розным прыватным арганізацыям не беларускім, зьезд дамагаецца дапамогі і для Т-ва Бел. Школы, а таксама зацьвярджаньня праз адносныя ўлады пастаноў валасных самаўрадаў аб выданьні дапамогі для беларускіх гімназіяў Т-ву Бел. Школы.

7) Пратэстуючы проці выдаленьня вучняў з Навагрудзкай Гімназіі... (апошнія словы рэзалюцыі да высьвятленьня справы звальненьня вучняў — **Рэд.** не падае, не жадаючы наперад уносіць пэўную дэзарганізацыю).

Рэзалюцыя прынята аднагалосна.

Вечарам для ўчасьнікаў зьезда і для публікі быў зладжаны спэктакль. Пастаўлена п'еса: „Дзядзька Якуб" і мастацкі прадэклямаваны лепшыя творы беларускай паэзіі. Уражаньне ад зьезду, ня гледзячы на вельмі вострае захаваньне прадстаўніка адміністрацыі, як і ад вечарыны, засталася найлепшае.

Чэсьць Вялейчанам, перадавым змагаром за родную культуру, за родную школу.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Набраўся так, што аж душой рыгнуў.

(Браслаўшчына).

На сьвятога Юрыя па новаму стылю урадоўцы Браслаўскага староства Рамаоўскі, Жук і Вайцэхоўскі па запросінах мельніка Маслоўскага, які жыве ў засц. Вусвіца (7 верст ад Браслаўя) паехалі да яго ў госьці.—Як гэта—зьдзівіцца не адзін, хто ведае Маслоўскага — да такога мужыка, хамуйлы, які навет і гаварыць ня можа — заікаецца, ды ходзіць, як тая варона пасьля дожджу, папусьціўшы крыльлі, да такога прасьцяка і паехалі ў госьці гэтакія ганаровыя ўрадоўцы?! А вось-жа паехалі, на свае вочы бачыў! Дый і ня дзівецеся, браткі, паедуць яны да кожнага з нас, абы толькі ведалі-б, што будзе чым сагрэць душу! Маслоўскі для такіх дарагіх гасьцей не пашкадаваў і сьпірту, і ўсялякай горкай, і салодкай — еж хоць лопні! Да гадз. 2-й ў ночы паночкі так налізаліся, што ажна, як кажуць, з чубоў пара пайшла, а нябошчык, царства яму нябеснае, Рамаоўскі—дык і зусім з ног далоў. Мельнік запрашаў (не падумайце, што Рамаоўскага — той зусім гаварыць ня мог), каб яго калегі засталіся начаваць, але як-жа застацца, калі на заўтра трэба „ужэндаваць"? Вязьці дамоў—няма як: прыехалі на казе, а як ж ты яго гэткага чурбана ўзвалішь на яе? Паслалі фурмана ў Браслаў, каб перапрог у лінейку. Праз гадзінку прыляцеў фурман ужо на лінейцы (ўрадавыя-ж коні добрыя!) і тагды яго беднага, пры помачы ўсёй сям'і мельніка (ня дзівота, пакойнік важыў пудоў васьмярню!) ўзвалілі на яе і пакацілі, клюючы насамі ўдол. Калі Рамаоўскага ўнесьлі ў памешканьне, дык яго кумпаны заўважылі штосьць нядобрае, бо-ж ён ужо ня быў падобны да жывога чалавека. Скарэй паклікалі дохтара, але ўжо было позна—аддаў гарамыка Богу душаньку! Жонка ў голас:—як цяпер жыць буду з гэтакай аравай дзяцей, чым выплачу больш тысячы доўгу?—дый да старасты. — Хай, кажа, яны (Жук і Вайцэхоўскі) бяруць цяпер і дзяцей і плоцяць доўг, калі атруцілі майго мужа!— Пан староста выясьніў, што гэта сталася ад „разрыву сэрца" і таму адправіў бабу ні з чым.

Хавалі нябошчыка дык надта пекна: з музыкай, занясьлі ў касьцёл, сабраліся ўсе ўрадоўцы, шмат народу, а званы дык ледзь не паразьбівалі званячы. Сяляне толькі ўздыхалі.—Вось Божухна, каб гэтак нашага брата, дык ня пусьцілі-б у магілкі хаваць і навет пяяць ксёндз забараніў-б, а як па ім, дык і сам пяе ўва ўсе горла!

—·—

Шмат хто пацікавіцца ведаць, за што гэта так частаваў паноў урадоўцаў мельнік? Пэўне-ж не па-„колежэнску", бо-ж ён у іх ніколі ня быў у гасьцях і ня будзе; спаткаўшыся пры людзех яны стыдаліся-б навет з ім гаварыць. Справа тут вось у чым! Пакойнік Рамаоўскі быў членкам камісіі ўвлашчэнёвай, а Маслоўскі вядзе ў ёй справу, хочучы прыўласьціць сабе кусок зямлі ад 3-х дзесяцінных абшарнікаў з вёскі Азіраўцы. Дык, знача, закідаваў наперад, а мо' ўжо і назад, бо-ж 19/IV с. г. камісія прызнала, што ён мае права на ўвлашчэньне. А Вайцэхоўскага за што? Ну, ён можа памагчы атрымаць пазваленьне на аружжа, а можа і так сабе, па дружбе з Рамаоўскім: смутна-ж было аднаму ехаць, дык захапіў з сабой „калегаў" — Маслоўскі багаты, хопіць для ўсіх!—думаў. Аж праўда! як для каго, а для яго дык хапіла! **Свой-тутэйшы.**

І мы разбудзіліся!...

(В. Дзешкавічы, Старавейскае вол., Слонімскага пав.).

Доўга мы спалі непрабудным сном цемры, але ўсё-ж разбудзіліся! Запісаліся мы ў сябры Т-ва Бел. Школы і 7-га красавіка арганізавалі Гурток.

На арганізацыйным сходзе, перад выбарамі Управы, узяў слова адзін наш сябра і акрэсьліў жыцьцё нашага гаротнага сярмяжнага люду, яго цемру, казаў, як выйсьці з гэтае цемры да сьветлае і лепшае будучыні!

Ен казаў, што мы цёмныя, сьляпыя... Мы ходзім вошчуп'ю, у поўдзень—як у вечары, паміж жывых — як мёртвыя. Нашыя дзяды, бацькі і мы чакалі, што нехта прыйдзе і навучыць нас, павядзе да лепшае будучыні... Але цяпер мы бачым, што ўсе „культурнейшыя" людзі адмовіліся ад нас і пакінулі нас адных у гэтым начным тумане. Маленькая толькі частка нашае сьвядомае інтэлегэнцыі прылучылася да нас і паказвае нам дарогу, як вучыцца і змагацца з цемрай. Чытаючы газэты, даведваемся, што ў другіх вёсках і мястэчках працуюць на культурна-асьветнай ніве і ўжо не адзін год! Дык пара і нам прабудзіцца! Няхай сябры, якія можа змарыліся, працуючы на гэтай ніве, пачуюць наш голас, што мы прабудзіліся і ідзём ім на помач. Яны ад радасьці забудуць сваю змучанасьць і зноў схопяцца за працу. Дык вось, сябры, мы тут сабраліся зрабіць нешта цэлае з паасобных сяброў. А што?—Гурток Т-ва Бел. Школы — гэтую маленькую крынічку чыстай вады, якая цячэ ў рэчку, а рэчка ў мора — мора вялікай адраджэнскай барацьбы беларускага працоўнага Народу.

Каб Гурток наш добра працаваў, мала слухаць прыгожых слоў, а ўсе нашыя гутаркі ператварыць у работу, трэба ўсе нашыя здольнасьці аддаць на гэтую-ж работу. Уступаць у сябры трэба сьвядома і ахвотна, бо сябра, уступіўшы неахвотна, падобны да гнілой бульбы, якая сама гніе і другіх заражае. Сябры, трэба кінуць п'янства, ігру ў карты і другія шкодныя гульні, а ставіць спэктаклі, закладаць бібліятэкі-чытальні, народныя дамы і г. д.

Праслухаўшы такую прамову ад шчырага сэрца, заварушылася ў сэрцы маладых сяброў: яны пастанавілі змагацца з цемрай і паставіць культуру на належную вышыню.

Тут-жа на сходзе пастанавілі адчыніць бібліятэку-чытальню і выбралі яе загадчыка.

Падлажыўшы такі фундамант, верым, што ня спыніцца наша праца, а поўным шагам пойдзем наперад, нясучы сьветач асьветы працоўным людзям. **М. К.**

З жыцьця Горадзеншчыны.

Яшчэ перад Вялікаднем бяз дай прычыны заарыштаваны і цяпер сядзяць у вастрогу Сьвяртока Арсэн з в. Каленікі і Шугай Ігнат з сынам з в. Няцечы — усе Лашанскай гміны Горадзенскага павету.

Вось, як у нас ні дня ні гадзіны ня знаеш, калі ўкінуць у вастрог!

Рэдактар-Выдавец: А. Лагода.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.